ДУК "Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"
Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

НАРОДНЫЯ МАЙСТРЫ УШАЧЧЫНЫ



# СЯРГЕЙ АЛЯКСЕЕВІЧ РОЎБА

**(народны майстр разьбы па дрэву)**

Ушачы

***Адыходзяць людзі ў нябыт,***
***Застаюцца ў спадчыну іх рэчы.***

***Калі ўсё пакінуць і забыць,***
***То хваліцца нам нашчадкам будзе***
***нечым.***

# ВЁСКА ЗА БОРАМ

З усіх бакоў абгароджана лесам гэтая раскінутая вёсачка. Борам аддзелена ад Матырына, усяго некалькі кіламетраў лясной дарогі да Ухвішча Полацкага раёна. Адсюль і назва – Забораўна.




Ды і раскінутай такой яна была не заўсёды. Перад вайной сюды перавезлі хаты з навакольных хутароў, якіх, дарэчы, было нямала, вось і разраслася вёска.

Вось тут у ціхім куточку Ушаччыны 1 студзеня 1936 года ў простай сялянскай сям’і нарадзіўся маленькі хлопчык Сярожа. Бацька Роўба Аляксей Андрэевіч і маці Таццяна Макараўна – мясцовыя жыхары. Маці працавала ў калгасе, а бацька па стане

здароўя выконваў часовыя работы. Сям'я Роўбаў мела сваю гаспадарку. Трэба было шмат працаваць, каб пракарміць вялікую сям'ю, у якой падрасталі дочкі-блязняты Ніна і Марыя, дачка Вольга, сын Мікалай і малодшы Сяргей.



Усе клопаты па гаспадарцы ляглі на рукі адной матулі Таццяны Макараўны, бо бацька памер, калі Сяргею было ўсяго два тыдні ад роду. Летам старэйшыя дзеці кожны дзень бегалі ў суседні лясок, каб сабраць грыбоў і ягад і дапамагчы маці пракарміць сям’ю. Падрастаў Сяргей і разам са старэйшымі захапляўся хараством родных мясцін, бачыў ва ўсім прыгожае і аб убачаным расказваў дома, прыносіў з лесу прыгожыя рэчы: корань асаблівай формы, галінку дрэва або сучок. А як было не любіць гэтыя мясціны! Зялёныя пагоркі, квітнеючыя сады, унізе непадалёку рака… І пах сена. Усё паветра напаўнялася гэтым цудоўным водарам.

# ”АБГАРАДЗІЛАСЯ ГОРАМ ЗАБОРАЎНА“

*На ўсёй зямлі не хапіла б сабораў*
*На аплакванне ахвяраў навалы.*
*Не засланілася борам Забораўна –*
*Тут смерць днявала і начавала.*

*Рыгор Барадулін*

Цяжкімі для сям’і Роўбаў былі гады ваеннага ліхалецця.

Гэта было 5 мая 1944 года. Лясная вёска знаходзілася ў непасрэднай блізкасці да партызан. Многія вяскоўцы самі былі ў атрадах. Мелі зносіны з роднымі. Ды і забораўцы дапамагалі партызанам, чым маглі.

Але нават не з-за сувязі з партызанамі трапілі пад кулі карнікаў мірныя жыхары. У той дзень луг, што ў зацішку між лесам, быў увесь засланы забітымі немцамі. Яны трапілі ў засаду да партызан, што схаваліся з двух бакоў ад лагчыны і здзейснілі прарыў варожай блакады. Жывымі засталося некалькі немцаў, якія ахоўвалі зачыненых у памяшканні вяскоўцаў. Ворагі і паклікалі дапамогу. Тады ў вёсцы з’явіліся карнікі, якія абыходзілі двор за дваром і на месцы растрэльвалі ўсіх мужчын. Усіх астатніх – жонак і дзяцей адразу пагналі ў лагер пад вёску Жары. Там жа аказаліся старэйшыя сёстры Роўбы Сяргея Ніна, Марыя і Вольга. У Жарах іх трымалі два тыдні, а потым быў лагер у Лепелі, адкуль усіх пагналі ў Германію, дзе адбылі да 1945 г. У гэты час старэйшы брат Сяргея Мікола змагаўся разам з партызанамі. І толькі адзін Сяргей быў разам з маці.

# ШКОЛЬНЫЯ ГАДЫ

У 1946 годзе Роўба Сяргей пачынае вучыцца ў 1 класе Плінскай сямігадовай школы. Яго першай настаўніцай была Харчанка Пелагея Філімонаўна.


Приказ № 3
По Плинской семилетней школе
от 3 августа 1944 года
На основании приказа Ушачского отдела народного образования от 2 августа 1944 года назначить преподавателем первого класса „б" и иностранного языка 5-6 классов Харченко Пелагею Филимоновну.

**Былая настаўніца пачатковых класаў Струннікава Ніна Сельвестраўна, якая пачала працаваць у школе ў 1951 годзе ўспамінае:** ”Сяргей быў незвычайным хлопцам. Ён вельмі цікавіўся жывой прыродай. У школу з пустымі рукамі ён не прыходзіў, а заўсёды прыносіў з сабой галінку дрэва з прыгожымі лісточкамі, лісток папаратніка. Вельмі любіў збіраць расліны для гербарыя, якія вучні складалі разам з настаўніцай“.

У 1955 годзе Роўба Сяргей заканчвае Плінскую сямігодку (загад №186 ад 20.06.55г.).



Приказ № 186.
по Плинской семилетней школе Селищанского с/с
Ушачского р-на Витебской обл.
От 20/VI-55 г.
Считать окончившими Плинскую семилетнюю школу следующих учащихся:

| | |
|---|---|
| 1. Асташонок Николай. | 10. Мища Владимир. |
| 2. Буткевич Валентина. | 11. Ровбо Сергей. |
| 3. Кохан Галина | 12. Садовская Бронислава |
| 4. Короленко Василий | 13. Чумба Нелля. |
| 5. Лабёнок Галина | 14. Ясинич Валентина |
| 6) Пашута Ольга. | 15. Чумба Антонина. |
| 7. Баращик Галина. | 16. Чобот Нина |
| 8. Пашута Геннадий. | 17. Халёнок Антонина. |
| 9. Спиридёнок Галина. | 18. Шорец Евгения. |

Директор семилетней школы:

**З успамінаў аднакласніка Асташонка Мікалая Нікіфаравіча (настаўніка Плінскай АСШ):**

”Разам з Сяргеем я вучыўся два гады, ў 6 і 7 класе. Да агульнаадукацыйных дысцыплін Сяргей не меў вялікага інтарэсу, а любімымі ўрокамі яго была праца. Тут ён вырабляў такія ”дзіковінкі“, што нельга было адарваць вачэй. Сяргей таксама вельмі любіў маляваць і меў да гэтага добрыя здольнасці. Асабліва добра атрымоўваліся ў яго ілюстрацыі да літаратурных твораў. Вось як зараз бачу перад сабой ілюстрацыю да байкі Крылова “Кукушка и петух”. На яго карціне яны выглядалі як жывыя. Гэту карціну бачылі на выставе ў школе, потым на раённым конкурсе творчасці дзяцей і потым была накіравана на абласную выставу. І вучні і настаўнікі бачылі, што расце мастак. Афармленне насценгазет, стэндаў davяралі Сяргею Роўба“.

Пасля заканчэння школы Роўба С. працаваў ў мясцовым калгасе (1955 – 1957г.г.).

# СЛУЖБА Ў АРМІІ

Напрыканцы 50-х гадоў Роўба Сяргей Аляксеевіч праходзіў службу ў радах Савецкай Арміі ў Гродненскай вобласці. Па стане здароўя быў камісаваны.



# ПАЛЮБІЎСЯ ГОРАД НА НЯВЕ

*1962-1963г.г.*

У гэты час у г. Ленінградзе пражывала старэйшая сястра Сяргея Аляксеевіча Роўбы Ніна Аляксееўна. Яна і запрасіла да сябе брата ў горад на Няве. Ведаючы цяжкае сямейнае становішча, сястра дапамагла яму ўладкавацца на працу мастаком-афарміцелем на цэнтральную вадакачку г.Ленінграда, якая размяшчалася побач са Смольным. Ад гэтай арганізацыі атрымаў аднапакаёвую кватэру і стаў самастойна жыць і працаваць, а завочна вучыцца ў народным універсітэце мастацтваў, які закончыў у 1966 г. з адзнакай ”добра“ факультэт ”Выяўленчае мастацтва“**.**





МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РСФСР
ЦЕНТРАЛЬНЫЙ ДОМ НАРОДНОГО ТВОРЧЕСТВА
ИМЕНИ Н. К. КРУПСКОЙ
ЗАОЧНЫЙ НАРОДНЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИСКУССТВ
Дубликат
СВИДЕТЕЛЬСТВО № 6007
Тов. Ровба
Сергей Алексеевич
окончил в 1966 году курс основной
факультета изобразительного
искусства
с общей оценкой хорошо
24 ноября 1966 года

Увесь вольны час пасля работы Сяргей Аляксеевіч аддаваў маляванню карцін маслянымі фарбамі, вырабу рэчаў з дрэва.





Сам сябе не лічыў вялікім жывапісцам, хоць меў і пейзажы, і партрэты людзей. Асабліва дарагі яму быў партрэт ленінградкі, напісаны ў час вучобы і працы ў горадзе на Няве.

**З расказа вучаніцы 9 класа Шчарбінінай Алёны:**

”У дзень правядзення выхаднога дня (2003г.) мы разам з настаўніцай пачатковых класў Стрыжонак Г.І. наведалі легендарную вёску Забораўна, пазнаёміліся з яе жыхарамі. Сярод іх быў майстар-самавук Роўба Сяргей Аляксеевіч. Я памятаю, як ён расказваў нам аб жыцці і працы ў г.Ленінградзе. І мне запомнілася, што першую лыжку з дрэва ён зрабіў там. Гэта была лыжка з акацыі з пушкінскага парка. Пасля адной з навальніц вывернула вялізную акацыю, і Сяргей Аляксеевіч змог узяць у невялікі пакой толькі кавалак дрэва. Ён шкадаваў аб тым, што колькі можна было б зрабіць лыжак і розных вырабаў з усяго дрэва, каб можна было забраць усё“

**З успамінаў Асташонка М.Н.:**

”У 1969 годзе мне давялося быць у г.Ленінградзе. Зразумела, я не мог паехаць дадому і не пабачыць земляка і былога аднакласніка. Ужо тады быў здзіўлены, колькі твораў мастацтва было зроблена рукамі Сяргея. Ён дастаў поўны мех вырабаў з сучкоў, галінак, каранёў, каштоўнага дрэва. ”Это мой творческий труд за несколько лет“ – толькі гэта і сказаў Сяргей. Ён не любіў шмат гаварыць пра сябе. Спакойны па характару быў чалавек, але я пры размове адчуваў, як глыбока ён думае“.

# ”ЛЮБОЎ МАЯ, СКРЫПКА“

Наведванне выставачных і канцэртных залаў вялікага горада зрабіла сваё адценне на творчасці мастака. Меладычнае гучанне скрыпкі запала ў душу Сяргея Аляксеевіча. Яго пачалі хваляваць сакрэты вырабу самога інструмента і не пакідала думка, чаму ў кожнага інструмента сваё гучанне, што вызначае гук, чаму дужка на адным месцы, а не на другім…

І пачаліся эксперыменты. Сяргей Аляксеевіч чытаў спецыяльную літаратуру, збіраў артыкулы з газет, гутарыў з творчымі людзьмі. Узброіўся няхітрымі інструментамі і прыняўся за вопыт. Для гэтага выкарыстоўваў асаблівую яліну, з якой выраблялі верхнюю частку скрыпкі і многія другія асаблівасці, якія ён увасобіў у музычны інструмент. Многа часу аддадзена гэтай справе, і сёння мы можам бачыць пяць скрыпак мастака, якія захаваліся ў доме сястры.

Музыкантам Сяргей Аляксеевіч не стаў. Іграць, праўда, мог для родных і блізкіх.

**Успамінае Асташонак М.Н.:**

”Сяргей Аляксеевіч некаторы час працаваў вартаўніком сада, які размяшчаўся каля смолзавода. Навакольнае асяроддзе спрыяла лірычнаму настрою, і ён гадзінамі мог граць на скрыпцы“.



# ВЯРТАННЕ НА МАЛУЮ РАДЗІМУ

Лёс распарадзіўся так, што ў 1984 годзе Роўба С.А. вяртаецца ў родную вёску Забораўна і жыве ў хаце роднай сястры Марыі Аляксееўны – былога вязня канцлагера.

І, як у кожнага вяскоўца, у яго хапала спраў з агародам, любіў пчол. А ва ўсім наваколлі не было закуточка, дзе б ён не пабываў, які б не агледзеў сваім мастацкім вокам.

**З расказа сястры Сідаровіч Марыі Аляксееўны:** ”Праца з дрэвам і прыродным матэрыялам была для брата лепшым адпачынкам. Ён умеў карысна і прыгожа выкарыстаць любыя даступныя дары прыроды. Дах над драўнікам зрабіў з трыснягу. Сцяна ў паветцы – з дробненькіх галінак кустоўя, цяпліцы – з лазы. Ды і сам дом змяніўся пасля яго прыезду. Сяргей Аляксеевіч патынкаваў драўляную хату цэментам, дробным пяском і глінай. Падмурак аддзяліў зялёным ”канатам“, у тон яму зрабіў і налічнікі на вокнах.





Прыгожую зрабіў майстэрню. Выканана яна ў выглядзе аркі з мноствам вузенькіх загнутых дошчачак, без адзінага цвіка.

А яшчэ Сяргей Аляксеевіч зрабіў барометр. Але гэта была толькі назва ад звычайнага барометра па вызначэнню вільготнасці паветра, выведзеная на картоне з меткамі дзялення. А насупраць – частка сухога ствала з доўгім суком, які і быў стрэлкай незвычайнага прыстасавання. Усё нерухомае: і паўмесяц картона, і само дрэва трывала замацаваны на арцы цяпліцы. Брат казаў, што ён нічога не прыдумваў. Гэта тое, што засталося ад дзядоў. Яліна і сук на ёй не крананы, той, што і рос. Калі вільготнасць вялікая, ён распрамляецца і падымаецца да верхняга дзялення. Калі суха, то апускаецца яшчэ ніжэй да адзнакі ”суха“‘‘.

***Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.***
***Каб светла-залатую яго ніць***
***Віць і далей – любоўю, справай дзейнай***
***Ды словам, што ад справы неаддзельна.***
***Тварыць!***

***Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.***
***Надзеяй, праўдай, мужным парываннем,***
***Высакародным, дружным намаганнем,***
***Што потым зоркай у вяках гарыць.***
***Тварыць!***

***Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.***
***Найлепшы самы, самы натуральны***
***Пачатак гэты вось жыццестваральны.***
***Інакш – якая ад жыцця карысць?***
***Тварыць!***

***Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.***
***Не марнаваць, не нішчыць, не бурыць, -***
***Тварыць!***

***А.Вярцінскі***



Ва ўмелых руках і палена спявае. Алегарычнае выказванне, але праўдзівае. Паглядзіш, як звычайныя кавалкі дрэва ў руках Сяргея Аляксеевіча Роўбы ператварыліся ў кухонныя прылады, іншыя карысныя і прыгожыя рэчы, і пераканаешся, што умелыя рукі і сапраўды здольны зрабіць цуд.

Адыходзяць старажытныя рамёствы. Зусім мала застаецца разьбяроў па дрэве ў нашай мясцовасці.

7 сакавіка 2006 года пайшоў з жыцця майстар-самавук, умелец Сяргей Аляксеевіч Роўба з вёскі Забораўна. У памяці застаўся яго – звычайна з барадой, ”сонечны“ капялюш са стужкай з кары бярозы, сам арыгінальны, як і арыгінальныя яго работы, з па-добраму хітрымі вачыма, загадкавай усмешкай.

Яшчэ калі Сяргей Аляксеевіч вучыўся ў выяўленчай студыі ў Ленінградзе, мастакі-настаўнікі заўважалі, што ў яго творчасці адчуваецца павеў язычніцкага фальклору. Любоў да прыроды, тонкае адчуванне яе адбівалася на ўсіх творах Сяргея Аляксеевіча. Ці то карціны, ці разьба па дрэве, ці пляценне з сітняку. Ён любіў увесь натуральны матэрыял, умеў з густам падбіраць яго.

Колькі самых розных рэчаў было выраблена яго рукамі! Шмат іх ён прадаў, а вельмі многа засталося. Больш за сто самых розных вырабаў народнага майстра сабралі пасля яго адыходу з жыцця работнікі Ушацкага Дома рамёстваў і цяпер чакаюць, каб усяму гэтаму каштоўнаму матэрыялу знайсці пастаяннае, надзейнае месца, каб захаваць плён рук адметнага творцы. А колькі вырабаў я убачыла яшчэ ў сястры Марыі Аляксееўны ў вёсцы Забораўна. Яна захоўвае іх як можа. Але ўсе яны патрабуюць большай увагі. З любоўю расказала Марыя Аляксееўна, што ведала пра іх.



Аднымі з прасцейшых вырабаў, якія былі ў майстра – гэта **драўляныя лыжкі** і іх разнавіднасці – апалонікі (лыжкі бальшых памераў і ёмістасці). Па форме яны круглыя ці

насковыя, прычым пераважаюць апошнія. Плаўны выгін тонкага плоскага чаранка, абцякальныя формы лыжкі



абумоўлены не толькі практычнымі, але і эстэтычнымі запатрабаваннямі. Усе ўшацкія лыжкі маюць самыя розныя адценні, хоць і не фарбаваныя, гэта натуральны колер грушы, балотнай акацыі, ліпы.

Больш дзесятка **палак для апоры** пры хадзьбе выраблена рукамі майстра. Усе яны адрозніваюцца адна ад адной: розны колер, розная канфігурацыя ручак для яе трымання.



У сялянскім побыце ў шырокім ужытку былі **драўляныя чарпакі**. Імі веялі зерне, чэрпалі ваду, адмяралі прадукты, з іх елі, пілі. Прызначэнне чарпакоў вызначалі іх канструктыўныя асаблівасці і адпаведнае вобразнае вырашэнне.

Сяргей Аляксеевіч Роўба таксама звярнуўся да вырабу такіх чарпакоў. Зробленыя эскізы на паперы сведчаць аб глыбокім бачанні задуманага.







У асноўным гэта былі маленькія коўшыкі для піцця.У іх ручкі задзёрнутыя ўгару: так зручней чэрпаць ваду з вядра. Кожны чарпак майстра эстэтычна аформлены ўзорамі featuring рознага характару. Вельмі своеасаблівай выглядаюць ручкі чарпакоў.

Яны нагадваюць птушыную галаву лебедзя, фігуру жанчыны і выконваюць ролю абярэгаў ад нячыстай сілы. Згодна са старажытнымі павер’ямі, некаторыя свойскія жывёлы і птушкі валодалі магічнай сілай адганяць злых духаў, і ў народзе шчыра верылі, што посуд, вырашаны ў адпаведных формах, надзейна захавае прадукт.

Каханне да ляснога хараства нарадзілася ў Роўбы С.А. ў 60-х гадах, калі аднойчы хаваўся ад навальніцы, а разам з ім





хаваліся яшчэ некалькі ”бярозавых дзівос“. Так майстар



прыйшоў да **карнепластыкі**. Гэта мастацтва ўмоўнае і даступна кожнаму, хто ўмее ўбачыць у гнілушцы, кары ці

галінцы знаёмы вобраз, нагадаць казку альбо адчуць песню ці проста настрой сваей душы. Так у майстэрні творца з’яўляюцца рагулі-карані, якія маюць выгляд лесуноў, вядзьмарак.

Сяргей Аляксеевіч заўсёды казаў, што займацца ім можа той, хто любіць прыроду, мае багатую фантазію і рукі майстра.






Сяргей Аляксеевіч проста на апрацоўцы каранёў не затрымаўся. Яму хацелася большага. І ён уводзіць у апрацоўку каранёў разьбу і стварае выразныя партрэты. Спалучэнне **карнепластыкі з разьбой** – справа нялёгкая, бо за гэтым крокам пачынаецца мастацтва скульптуры, якое не даруе прыблізнасці.



Вывучаючы работы Роўбы С.А., прыходзіш да высновы, што яго можна назваць яшчэ і **майстрам рэльефу**. У гэтых работах узмацнілася майстэрства рэзьбяра, праявілася ўся своеасаблівасць яго таленту. Майстар умела стылізуе ствараемыя формы, ператвараючы дэталі ў элементы ўзору. Яго работы адрозніваюцца павышанай дэкаратыўнасцю, ювелірнай апрацоўкай матэрыялу. Строга прадуманую кампазіцыю аўтар насычае арнаментам. Таніроўка ці абпальванне драўніны выяўляе багацце яе тэкстуры і стварае дадатковыя дэкаратыўныя эфекты.



Як патрыёт Ушаччыны, Роўба Сяргей Аляксеевіч мае сваю думку наконт паходжання  герба Ушач. І майстар выканаў барэльеф герба, ала не з агульна прызнанай сімволікай: у  руцэ яго не рашотка, на якой быў катаваны той, грэчаскі Лаўрэн, а рыбалоўная прылада, якую трымае за адну ручку, якая яшчэ называлася вухам. Чаму Ушачы, ці па беларуску правільна Вушачы, маюць множны лік, таму што не адзін Лаўрэн, а многа мужыкоў хадзілі па рацэ, і такімі прыладамі, трымаючы іх за вушы ўшчыльную адна да адной, выціскалі рыбу з трыснягу: інакш нічым не ўзяць. А рыбы было многа, яе потым прадавалі ў Полацку, а раку нават называлі ”залатой“. Яна і бачна за выявай Лаўрэна. У руцэ не лаўровая галінка, бо лаўр не рос ва Ушачы, і не так выглядае, а рачны трыснёг. Мне здаецца, што  гэтая версія больш блізкая да праўды.



Ёсць у майстра творы, якія выраблены ў тэхніцы **скразной рэльефнай разьбы**.



Паралельна з працай над рэльефамі многа займаецца Роўба С.А. **утылітарна-бытавымі вырабамі** – хлебніцамі,



сальніцамі, ствараючы спачатку эскіз, а потым саму рэч.









А як прыгожа выглядаюць мужчынскія і жаночыя чаравікі.



Майстар бачыў сваіх ”герояў“ у розных матэрыялах: карнепластыцы і на дыванах з лучыны.



А вось дыван, на якім увасоблена ў поўнай меры сялянскае жыццё.



Асобае месца ў творчасці мастака займаюць **дываны з лучыны**. Выраб іх патрабаваў вялікай і працяглай працы.

Падрыхтаваць лучыну пэўнай даўжыні і шырыні неабходна было ў кароткі тэрмін, бо сплесці дыван можна толькі з сырой лучыны. А потым была размалёўка па густу і настрою.

Роўба С.А. заўсёды быў  закаханы ў родны край,  яго людзей. Першым дывановым вырабам стала кампазіцыя ”Беларусі – 80 гадоў”. Спляценне яркіх фарбаў у цэнтры і цёмных  па баках надавала гэтай карціне веліч і прыгажосць.




Асобна стаяць творы, сюжэты да якіх узяты з высковага жыцця, гульняў і жартаў людзей. Усе яны сведчаць аб значных поспехах майстра ў стварэнні складаных шматфігурных кампазіцый, аб цікавасці яго да пластыкі чалавечай фігуры, яе вобразнасці, аб пошуках станоўчых вобразаў, іштo прывяло мастака да распрацоўкі высокага рэльефу, ярускай пабудовы кампазіцыі.



Асабліва цікава вырашае майстар пластыку твора: узараны роўнымі баразнамі лоб, умоўнае абазначэнне вачэй, геаметрыя вусоў і барады з графічным малюнкам паверхні.

Партрэт ”вядзмаркі“ пакарае сваёй унікальнасцю. Партрэтам назваў гэты  твор Сяргей Аляксеевіч, на самай справе гэта вялізарны бярозавы кап, над якім паваражыла прырода і які сумеў разгледзіць майстар.





Вось такія цудоўныя шэдэўры ствараў наш зямляк Сяргей Аляксеевіч Роўба. І яго творчасць была заўважана аддзелам культуры Ушацкага райвыканкама і Віцебскім абласным навукова-метадычным цэнтрам нацыянальнай творчасці і культурна-асветніцкай работы.

У 1998 годзе Роўба С.А. з’яўляецца лаўрэатам абласной выставы народнага мастацтва ”Кругазварот“ у рамках першага фестывалю народнага мастацтва Беларусі ”Беларусь – мая песня“.


ПЕРШЫ ФЕСТЫВАЛЬ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ

“БЕЛАРУСЬ - МАЯ ПЕСНЯ“

ДЫПЛОМ

ЛАУРЭАТА

АБЛАСНОЙ ВЫСТАВЫ

НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

“КРУГАЗВАРОТ”

разьбяр па дрэву

Сяргей Аляксеевіч

Роўба

(Ушацкі раён)

15 мая 1998 г.

г.Віцебск

АРГКАМІТЭТ

1997-1998

У гэтым жа годзе С.А.Роўба з’яўляецца ўдзельнікам кірмашу народных рамёстваў Беларусі, Расіі, Украіны ”Горад майстроў“ у рамках VII Міжнароднага фестывалю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“.



Асабліва плённым выдаўся для майстра 2005 год. Ён папранейшаму творча працаваў, таму стаў лаўрэатам абласнога конкурсу, прадставіўшы свае вырабы на выставе народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ”Жывая легенда“ у рамках другога Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва ”Беларусь – мая песня“, а таксама быў удзельнікам свята-конкурсу разьбярства ”Дрэва жыцця“ у рамках кірмашу народных рамёстваў і промыслаў XIV Міжнароднага фестывалю мастацтваў ”Славянскі базар у Віцебску“.



ДИПЛОМ

Дзяржаўная ўстанова
"Віцебскі абласны навукова-метадычны цэнтр
народнай творчасці і культасветработы"

УЗНАГАРОДЖВАЕЦЦА

СЯРГЕЙ РОЎБА

*удзельнік свята-конкурса разьбярства «Дрэва жыцця» ў рамках кірмашу народных рамёстваў і промыслаў XIV Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску"*

Я.М.САХУТА,
доктар мастацтвазнаўства,
старшыня журы

17 ліпеня 2005 г.
г.Віцебск

Госці нават высокага ўзроўню былі ў захапленні ад таго, што выраблена ўмелымі рукамі нашага земляка.



***С. А. Роўба з мастаком Дзям'янам Уладзіміравічам Крупеня на раённай выставе мастацкай творчасці.***



***«У майстра добры настрой»***
***С. А. Роўба на XIV Міжнародным фестывалі мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску"з галоўным мастаком Віцебскага навукова-метадычнага цэнтра нацыянальнай творчасці Нінай Лявонаўнай Федарыставай.***

Мастак Ушацкага Дома рамёстваў Міхаіл Антонавіч Казіцкі нярэдка наведваўся да Сяргея Аляксеевіча Роўбы пры яго жыцці, а пасля смерці напісаў гэты верш.

## МАЙСТРУ

**Я позірк кідаю**
**ўніз ад узмежка.**
**Да лесу вядзе**
**праз кусты яго сцежка.**

**А там – узвышэнне,**
**паўскрай – усё балота.**
**Не пройдзеш у дожджык –**
**абуць трэба боты.**

**Завецца куточак**
**сівой баравінай,**
**дзе з Майстрам сустрэўся,**
**як бег па маліны.**

**На ўсё, што стварыла**
**прырода навокал,**
**глядзеў гэты Майстар**
**прыжмураным вокам.**

**Разьбяр гэта месца**
**даўно запрымеціў,**
**лічыў: прыгажэй**
**не знайсці ў цэлым свеце.**

**Тут кожнае дрэўца**
**знаёма з юнацтва.**
**Аб гэтым ён мусіў**
**аднойчы прызнацца.**

**Дзе корч, дзе галінка,**
**дзе кап, ці калода, –**
**усё заўважаў,**
**што стварыла прырода.**

**Няма болей Майстра,**
**узышоў ён у вечнасць,**
**Зрабіўшы нямала,**
**абраў шлях свой млечны.**

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У кожнага народа – свае традыцыі, адпаведныя яго характару, ладу жыцця, прыродным умовам, звычаям. Так, у Беларусі, дзе шмат лесу, будавалі жыллё з дрэва, аздаблялі разьбой. Нашы продкі вымушаны былі самі ствараць неабходныя для жыцця рэчы, рэалізуючы пры гэтым і свае мастацкія імкненні. Але зараз быццам бы і няма патрэбы ў гэтым. Значна прасцей купіць металічную лыжку, чым выразаць яе з дрэва. Размаляваныя куфры змяніла сучасная мэбля. Народным майстрам як быццам і няма дзе прадэманстраваць свой талент. Тым не менш, народнае мастацтва жыве і сёння. Працягваюць развівацца тыя віды народных рамёстваў, у якіх ярка выяўлены мастацкія якасці. Вырабы сучасных народных майстроў уносяць у гарадскі інтэр’ер рукатворную цеплыню, непаўторнасць, характэрны мясцовы каларыт.

Знаёмства з народным мастацтвам – задача высакародная. але лепш, калі такое знаёмства стане асновай для спасціжэння сакрэтаў рамяства, прадаўжэння традыцый народнай мастацкай творчасці. А калі гэта немагчыма зрабіць, то трэба прыкласці ўсе намаганні, каб захаваць тое, што ёсць, што пакінулі пасля сябе вялікія майстры.

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Сухота, Я. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. – Мінск, 1996. – 109 с.
2. Газета ”Патрыёт“, 1998г., 13 чэрвеня – с. 2.
3. Газета ”Патрыёт“, 2005г., 1 чэрвеня – с. 3.
4. Газета ”Патрыёт“, 2006г., 23 верасня – с. 2.
5. Буклет ”Разьбяры Віцебшчыны“.

# ЗМЕСТ

Асноўная частка
– Вёска за борам………………………………………… 3
–”Абгарадзілася горам Забораўна“………………….. 6
– Школьныя гады…………………………………….. 7
– Служба ў арміі……………………………………… 9
– Палюбіўся горад на Няве………………………….. 10
–”Любоў мая, скрыпка“……………………………… 13
– Вяртанне на малую радзіму……………………….. 14
– Апісанне твораў мастака…………………………... 17
– Майстру (*верш*)…………………………………….. 34
Заключэнне…………………………………………… 35
Спіс літаратуры……………………………………… 36



**Сяргей Аляксеевіч Роўба** / складальнік Г. М. Сарокіна ; камп’ютарны дызайн Г. М. Кашненка. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2021. – 36 с. : іл., парт.

